3. Зёлкин, Н. На звание лучшего машиниста / Н. Зёлкин // Советская Белоруссия. – 1945. – 17 апреля. – С. 2.
4. Государственный архив Могилёвской области. – Ф. 7. – Оп. 5. – Д. 188. Переписка по вопросам транспорта. 7.01. – 29.12.1954 г.
5. Кость, А.В. Железнодорожная магистраль Белоруссии: К 100–летию со дня введения в строй / А.В. Кость, В.Ф. Лазаретов; под общ. ред. Е. П. Юшкевича. – Мн.: Беларусь, 1971. – 208 с.

# ПОГЛЯДЫ БСГ НА ВЫРАШЭННЕ АГРАРНАГА ПЫТАННЯ НА БЕЛАРУСІ Ў 1917 ГОДЗЕ

*А.Д. Тогулева*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Репозиторий ВГУ

Аграрнае пытанне для Беларусі, дзе асноўная маса насельніцтва да сярэдзіны XX ст. займалася сельскагаспадарчай працай, з’яўляецца адным з самых галоўных. Агранае пытанне, якое не было вырашана ні пад час рэформы 1861 года, ні пад час першай расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг., ні пад час рэформы П.А. Сталыпіна, заставалася вельмі актуальным пасля Лютаўскай рэвалюцыі і займала цэнтральнае месца ў дзейнасці першай беларускай нацыянальнай партыі – Беларускай сацыялістычнай грамады. Мэтай даследавання з’яўляецца аналіз дзейнасці БСГ па вырашэнню агаррнага пытання на Беларусі ў 1917 годзе.

**Матэрыял і метады.** У якасці матэрыяла былі выкарыстаны дакументы з фондаў НАРБ, артыкулы дзеячоў БСГ, апублікаваныя ў 1917 г. у газеце “Вольная Беларусь”, Праграма БСГ, прынятая на III з’ездзе ў Мінску ў кастрычніку 1917 г. Рэалізаваны лагічныя метады даследавання, а таксама метады гістарычна-параўнальнага і сістэмна-комплекснага аналізу навуковай літаратуры і крыніц.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Лютаўская рэвалюцыя ў 1917 г. знішчыла царскае самадзяржаўе. У ноч з 1 на 2 сакавіка Часовы Камітэт Дзяржаўнай Думы прыступіў да фарміравання Часовага ўрада . У выніку перагавораў з Выканкамам Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў Часовы ўрад быў створаны. Яго праграма, якая была ўзгоднена з Выканкамам Петраградскага Савета прадугледжвала амністыю палітычным зняволенным, свабоду слова, друку і г.д.

Усё гэта стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця ў краіне дэмакратычных асноў і адраджэння нацыянальных рухаў прыгнечаных народаў Расіі, у тым ліку і беларускага. Беларуская Сацыялістычная Грамада, якая была першай нацыянальнай партыяй беларускага народа, аднавіла сваю дзейнасць адразу пасля Лютаўскай рэвалюцыі. У звяржэнні самадзяржаўя і ўстанаўленні дэмакратычнага ладу ў Расіі яна бачыла ўмовы для сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення беларусаў.

25 сакавіка 1917 г. у Мінску адбылася канферэнцыя БСГ, дзе былі вызначаны прыярытэты па неадкладных пытаннях палітычнага жыцця краіны. У адносінах да аграрнага пытання БСГ прэтэндавала на ролю выразніка інтарэсаў беларускага сялянства, выказвалася за перадачу зямлі тым, хто на ёй працуе, але ў той жа час выступала супраць захопу сялянамі памешчыцкіх земляў, прапанавала чакаць, пакуль зямельнае пытанне вырашыць “краёвы сейм аўтаномнай Беларусі”. У рэзалюцыі па аграрному пытанню зазначалася: “У дадзены момант канферэнцыя арганізацый БСГ асуджае неарганізаваныя, анархічные выступленні на падставе аграрных адносін”(1, арк. 8–9).

4 чэрвеня 1917 г. у Петраградзе была склікана канферэнцыя партыі, на якую прыслалі дэлегатаў 17 арганізацый БСГ, у тым ліку Пскоўская, Мінская, Віцебская, Пецярбургская, Асіповічская і інш. Ад Масквы прысутнічаў дэлегат з дарадчым голасам (2, арк. 53).

Пад уплывам левага крыла, якое абапіралася на рабочых-беларусаў петраградскіх заводаў, салдат і матросаў, канферэнцыя паспрабавала выпрацаваць новую тактыку партыі з улікам развіцця рэвалюцыі і сфармуляваць некаторыя праграмныя патрабаванні.

Па аграрнаму пытанню праект партыйнай праграмы прадугледжваў наступныя патрабаванні: 1/забарона куплі і продажу зямлі, канфіскацыя зямлі ўдзельнай, панскай і інш. і пераход яе без выкупу ў карыстанне ўсяго народу, што на ёй працуе; 2/усёй зямлёй на Беларусі павінна загадваць Беларуская Краёвая Рада, яна сама парадкуе кавалкамі, патрэбнымі на перасяленне, а рэшту адабранай зямлі перадае мясцовым органам самакіравання (3, С. 3).

Такім чынам, да лета 1917 года БСГ ужо цалкам прыняла лозунг аб канфіскацыя панскіх зямель без вырашэння гэтага пытання Устаноўчым сходам.

III з’езд БСГ адкрыўся 14 кастрычніка 1917 г. На з’ездзе былі прадстаўнікі амаль ад усіх арганізацый БСГ: з Масквы – Я. Дыла, з Петраграду – Я. Варонка, З. Жылуновіч,

Б. Тарашкевіч, са Слуцка – Р. Астроўскі, з Мінска – А. Прушынскі, А. Смоліч, П. Бадунова, Л. Сівіцкая, з Гельсінгфорсу – М. Муха, з 12 арміі – І. Мамонька, Дадон, з Барысава – Шчыцёнак, з Бабруйску – Ф. Шантыр, Талчынская, Крычко, Бакшты-Бычкоўскі і Чэрнік, з Нарвскай арганізацыі – А. Чарвякоў, з 10 арміі – С.Рак-Міхайлоўскі, з Мінскай дружыны – В. Адамовіч і інш. (4, арк. 59).

З дарадчым голасам прысутнічалі Бандарчык, Шыла, Дварчанін, Лявіцкая, Данілевіч, Ласка і Галавач (5, арк.59).

На другі дзень з'езд пачаў разглядаць праект партыйнай праграмы, якая была ўсхвалена на партыйнай канферэнцыі 4-6 чэрвеня ў Петраградзе. Пасля невялікіх рэдакцыйных паправак, на апошнім пасяджэнні 25 кастрычніка была прынята партыйная праграма, якая складалася з 36 параграфаў.

У прадмове да асноўных праграмных патрабаванняў зноў было запісана, што "Беларуская Сацыялістычная Грамада мае сваёй канчатковай мэтай ажыццяўленне сацыялістычнага ладу праз развіццё міжнароднай класавай барацьбы і сацыяльнай рэвалюцыі" (6, С. 74–75).

Але як сведчаць далейшыя падзеі, гэта зноў быў толькі палітычны лозунг, які быў прыняты пад націскам левай рэвалюцыйнай часткі Грамады.

Зноў адным з галоўных пытанняў на з'ездзе стала аграрнае. Яшчэ ў верасні 1917 г. рэдактар "Вольнай Беларусі" і адзін з актыўных дзеячоў Грамады Язэп Лёсік у сваім артыкуле "Нашы патрэбы" прапанаваў два шляхі вырашэння зямельнага пытання. Першы шлях гэта такі, пры якім Устаноўчы сойм прымае закон, што "уся зямля ў нашым гасударстве належыць усяму народу... Пасля гэтага, кожны чалавек... можа ўзяць роўны з усімі кавалак зямлі ды сказаць, колькі дзесяцін... можна даць на душу... Гэты кавалак зямлі ніхто не мае права ні прадаць, ні залажыць, ані здаць у арэнду" (7, С. 1).

Другі шлях прадугледжваў не дзяліць зямлю паміж сялянамі, ні рэзаць яе на дзялянкі, бо пры такім парадку "ні павернімся ў полі з вялікай машынай і будзем поркацца з сахою, як дзяды нашы поркаліся". Гэты шлях прапаноўваў "...пасля таго, як зацвердзіцца закон, што ўся зямля пераходзіць да рук усяго народу, дык яе не трэба дзяліць на дробныя часткі, а каму колічы прырэзаць, а рэшту заставіць у вялікіх, асобных кавалках, якія будуць абрабатывацца тымі, хто не мае ўласнай гаспадаркі, – накшталт таго, як гэта робіцца на фабрыках і заводах... Дзеля загаду ўсёй працай на такіх вялікіх кавалках будзе выбірацца пры кожным месцы мясцовая "зямельная рада" (8, С. 1).

Пасля доўгіх спрэчак на пасяджэнні 16 кастрычніка былі прыняты асноўныя прынцыпы па вырашэнню аграрнай справы, якія мала чым адрозніваліся ад праграмных патрабаванняў БСГ, прынятых на ІІ з'ездзе ў 1906 г. і на партыйнай канферэнцыі Грамады 4–6 чэрвеня 1917 г. і адносіліся да першага шляху, які прапаноўваў Я.Лёсік : уся зямля народу; Зямельнай справай ведае Краёвая Рада;надзяленне не звыш працоўнай і не менш прадуктовай нормы (9, С. 1). Далейшая распрацоўка зямельнай праграмы была даручана рэдакцыйнай камісіі, у склад якой увайшлі Я. Варонка, А. Смоліч, Б.Тарашкевіч, Ф. Шантыр і Я. Дыла. Аднак неабходна адзначыць, што Фабіян Шантыр не прыняў удзел у гэтай працы, бо на пасяджэнні 17 кастрычніка быў выключаны з членаў БСГ за непавагу да сходу Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый.

У выніку ў адносінах да зямельнай справы былі прыняты наступныя параграфы праграмы БСГ:

1. Неадкладная забарона куплі і продажу зямлі.

2. Уся зямля без выкупу пераходзіць ва ўсенароднае ўладанне.

3. Зямля надзяляецца ў карыстанне толькі тым грамадзянам, якія ўласнаручна на ёй працуюць; памер надзялення не звыш працоўнай нормы і не менш прадуктовай.

4. Спецыяльны падатак на найбольш даходную зямлю / урадлівую, падгароднюю і г.д./ такіх памераў, каб ураўняць аплату працы на беднай і багатай зямлі /канфіскацыя пазямельнай рэнты/.

5. Усім зямельным упарадкаваннем на Беларусі павінна кіраваць Беларуская Краёвая Рада, выбраная ўсім народам пры дапамозе ўсеагульнага, прамога, тайнага і прапарцыянальнага галасавання. Рада сама ведае кавалкамі для перасялення, а ўсю канфіскаваную зямлю, якая застанецца, перадае ў распараджэнне мясцовых органаў самакіравання.

6. Пераход без выкупу ўсіх лясоў, рэк, зямельных нетраў ва ўсенароднае карыстанне на распараджэнне Краёвай Радай" (10, С. 75).

Праграма прадугледжвала дапамогу ў арганізацыі і развіцці вытворчай кааперацыі, а таксама шырокую падтрымку і распаўсюджванне кааператыўных арганізацый, спажывецкіх і крэдытных таварыстваў і інш.



Рэпазіторый БГУ

**Заключэнне.** Такім чынам, БСГ узнавіўшы сваю дзейнасць пасля Лютаўскай рэвалюцыі, актыўна ўключылася ў барацьбу за сацыяльную справядлівасць і нацыянальныя правы беларускага народа. Вясной 1917 г. БСГ яшчэ немела дакладна сфармуляванай аграрнай праграмы, але пэўныя погляды былі выказаны на партыйных канферэнцыях ў сакавіку і чэрвені 1917 г. У выніку абмеркаванняў і спрэчак партыйная аграрная праграма была прынята на III з'ездзе БСГ 25 кастрычніка 1917 г., калі палітычныя ўмовы зноў змяніліся і партыя не змагла прыступіць да яе рэалізацыі.


Спіс літаратуры

1. НАРБ. Ф. 60, воп.3, спр.179.
2. НАРБ. Ф.60, воп.3, спр. 749.
3. Пастановы Канферэнцыі БСГ //Вольная Беларусь.-1917. - 27 ліпеня.
4. НАРБ. Ф.60, воп.3,спр.749.
5. НАРБ. Ф.60, воп.3,спр.749.
6. Программа Белорусской Социалистической Громады (принята III партийным съездом - 14 - 25 октября 1917г. в Минске) // Палітычныя партыі Беларусі: Дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. -Мінск: Згода. - 1994.
7. Лёсік Я. Нашы патрэбы // Вольная Беларусь.-1917.-17 верасня.
8. Лёсік Я. Нашы патрэбы // Вольная Беларусь.-1917.-17 верасня.
9. Лёсік Я. Нашы патрэбы // Вольная Беларусь.-1917.-17 верасня
10. Программа Белорусской Социалистической Громады (принята III партийным съездом 14 - 25 октября 1917 г. в Минске) // Палітычныя партыі Беларусі: Дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. -Мінск: Згода. - 1994.


## ПРОМЫШЛЕННЫЙ ПОТЕНЦИАЛ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ КАК ОСНОВА ЭКОНОМИКИ РЕГИОНА


*Л.Ф. Трацевская*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


В настоящее время конкурентоспособность как национальной, так и региональных экономик Республики Беларусь во многом определяется их промышленным потенциалом. Особенно велико значение данного фактора в современном развитии и функционировании экономики Витебской области как ключевого индустриального региона Беларуси, что предопределило актуальность проведенного исследования.

Целью данной публикации является характеристика состояния промышленного потенциала Витебщины на современном этапе.

**Материал и методы.** Материалом послужили труды отечественных ученых-экономистов, статистические данные, характеризующие современное состояние промышленности Витебской области. В качестве основных методов исследования использовались логико-дедуктивный, восхождение от абстрактного к конкретному, анализ и синтез.

**Результаты и их обсуждение.** Основу сформированного на территории региона хозяйственного комплекса составляет промышленность, в которой занято 24,1% общей численности экономически активного трудоспособного населения, производится 78% регионального ВВП, 33,5% валовой добавленной стоимости [1].

По ряду товарных позиций Витебская область занимает монопольное или доминирующее положение на отдельных рынках, что позволяет судить о ее заметной роли в структуре экономики Беларуси. Так, регион производит 100% республиканских объемов стеклотканей, акриловых волокон, полиэтилена высокого давления, 44% электроэнергии, 54% металлорежущих станков, 50% телевизоров, 67% рапсового масла. На территории области расположены РУПТП «Оршанский льнокомбинат», производящий 100% льняных тканей республики, ОАО «Витебский ковровый комбинат», доля продукции которого в республиканских объемах коврового производства составляет 90%, а также комплекс обувных предприятий, производящих 48% республиканских объемов данной товарной группы и др. Кроме того, в регионе находится единственный в Беларуси меховой комбинат [2].

Помимо указанных предприятий, решающее влияние на результаты работы экономического комплекса области оказывают индустриальные объекты республиканского значения – ОАО «Нафтан», завод «Полимир», ОАО «Полоцкстекловолокно». Промышленный потенциал региона имеет открытый характер и ориентирован на внешние рынки. По большинству видов продукции экспорт составляет более 50 производимого объема, по отдельным товарным

Репозиторий ВГУ